№ 51. Ausgabe B.

# ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты: на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы — 1 м. 20 ф., на 1 мес. — 40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.
Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрації і экспэдыціі: М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак: на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі — па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 51 (143). Год II. Вільня, 26 чэрвеня 1917 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.).

## Закрыцьце варшаускаго унівэрсытэту.

### 25 чэрвеня.

Заходні тэатр:

*Фронт Рупрэхта Баварскаго*: На узбярэжжы мора і між Іпрам і Ліс артылерыйская бітва ўчора узмапавалася і трывала да ночы. Ад каналу Лябассэ да палудзеннаго берагу Скарп агневая чыннасць гэтак сама была жывейшая, чым тые дні. Перад абедам адбіты англіцкіе наступленьня на поўначы ад Сушэ і на ўсходзі ад дарогі з Ленс у Аррас. У вечары ворагі паўтаралі свае атакі наабол Сушэ, але былі адбіты. Вялікіе англіцкіе сілы, штурмаваўшые пры Іліш, адбіты ў начы штыкамі і агнём.

*Фронт нямецкаго Насьледніка*: Французы двойчы атакавалі пры Воксэйён, але былі адбіты і мелі на адкрытым мейсцы вялікіе страты ад нашаго агня.

Чыннасць артылэрыі, наагул, крапчэла.

---

Учора збіты 8 самалётаў і 3 прывязные лятучые шары.

Усходні тэатр:

Востры агонь на верхняй Стрыпе і між Залатой Ліпай і Нараёўкай. Тут мы ўзялі з расейскіх акопаў некольні палонных. У Карпатах на поўначы ад Кірлі Бабы баевая чыннасць жывейша, чым звычайна.

---

ВАРШАВА. (В.Т.Б.). Між студэнцкай моладзьдзю варшаўскіх вышэйшых школ у апошніх тыднях узняўся рух проці прызнаньня унівэрсытэцкаго ураду; ён выяўляўся найбольш у адмові плаціць грошы за апошні сэмэстэр. З гэтай прычыны генэрал-губэрнатар **Бэзэлер загадаў спыніць чыннасць абедзьвых вышэйшых школ у Варшаві.**

ВЕНА. Паводлуг вестак з Варшавы, спаўніцельная камісія польскай дзержаўнай рады на сваім апошнім заседаньні занімалася пытаньнем аб **організаціі рэгенцкай рады,** каторая будзе чынна да аканчацельнаго назначэньня ў Польшчы рэгента.

ПЕЦЯРБУРГ. (П.Т.А.). На агульным **з'ездзі дэпутатоў ад казацкіх войск** прэдстаўнікі сібірскіх і донскіх казакоў падалі голас проці сэпаратнаго міра і за далейшае наступленьне ў еднасьці с саюзьнікамі.

ПЕЦЯРБУРГ (П.Т.А.). 21 чэрвеня вялікі сход салдатоў-максымалістоў прыняў рэзолюцію, каб 23 чэрвеня была зроблена дэмонстрація арміі проці тымчасоваго ураду. Назаўтра максымалісты расклеілі на вуліцах адозву, прызываючы салдатоў выйсьці на вуліцу с клікамі: «даволі вайны! мы хочэмо хлеба і міра!» С прычыны гэтых прыпадкоў тымчасовы урад сягоньня раніцай выпусьціў адозву, прызываючы народ быць спакойным.

З'езд усіх рад раб. і салд. Расеі, спаўніцельны камітэт пецярбурскай рады раб і салд., спаўніцельны камітет з'езду селян і спаўніцельные камітэты соцыалістоў і трудавікоў выпусьцілі разам адозву, прызываючы салдатоў і работнікоў устрымацца 23, 24 і 25 чэрвеня ад уселякіх дэмонстраций, бо яны маглі бы быць карысны толькі для контррэволюціі.

Спэцыальная камісія дзеля разгляду праекта закона аб выбарах у установчы сэйм намеціла чысло дэпутатоў на 800 душ. Гэтак 1 дэпутат прыпадае на 200.000 жыхароў. Кожная правінція становіць выбарны округ ня менш як с 5 дэпутатоў. Пецярбург і Масква становяць асобные выбарные округі.

ЖЭНЕВА. Вярнуўшыйся з Расеі французскі міністэр Тома кажэ, што пецярбурская рада раб. і салд. прыстане толькі на такіе умовы с саюзьнікамі, каторые не баяцца сьвету і могуць быць апублікованы.

РОТТЭРДАМ. Як даносяць с Пецярбурга, Керэнскій пазволіў організаваць жаноцкіе батальёны. Запісаліся ў іх ужо некольні сот маладых дзеўчат.

МАСКВА. «Русск. Сл.» даносіць:

Тымчасовы урад прызнаў патрэбным знаёміць паслоў саюзьніцкіх старон с пераменалі ў складзі вышэйшай каманды расейскай арміі. Міністэр Тэрэшчэнко у свой час паведаміў англіцкаго і францускаго паслоў аб прычынах пазбаўленьня каманды Алексеева і Гурко. Гэтак, тымчасовы урад лічыць патрэбным апраўдывацца перад саюзьнікамі і аддаць пад іх кантроль свае чыннасьці.

ШТОКГОЛЬМ. С Пецярбурга даносяць, што расейская рэволюція ўходзіць цяпер у новы фазіс: змаганьня між капіталістамі і работнікамі. Невядома толькі, ці капіталізму удасцца абярнуць Расею у сваю служку і служку заходніх саюзьнікоў.

БЕЛА. Тут 23 чэрвеня начала выхадзіць першая ў межах Обэр Ост украінская часопісь «Рідне Слово».

## Аутономія Беларусі.

Окупація часьці Беларусі нямецкімі сіламі, прызнаньне тут нацыональных правоў беларускаго народу — гэта тая іскра, каторая запаліла вялікі пажар нацыональнай сьвядомасьці і на тых абшарах Беларускай зямлі, якіе асталіся с таго боку ваеннаго фронту. І калі ў Расеі адбыўся вялікі гасударственны пэрэварот, разбіўшый стары дзержаўны лад, Беларусь падала свой голас, паказала, што яна жыве і дабіваецца вольнаго, самабытнаго жыцьця. Формулу, ў каторай выявіўся беларускі рух у Расеі, мы падалі ўжо ў апошнім нумэры—ў тэлеграмі, ў якой гаворыцца дасло̆уна: Беларускі Народны Камітэт апавешчае свае трэбаваньня, жадаючы перастройкі Расеі ў фэдэрацыйную рэспубліку і незалежнасьці Беларусі.

Цяпер, сабраўшы ўсе дайшоўшые да нас праз газэты і прыежджаўшых у розным часі з Расеі людзей, мы можэм болей меней даць абраз беларускаго руху пад Расеяй.

Зара пасьля пэрэвароту ў Пецярбурзі быў апавешчэн сазыў дзержаўнай рады Літвы, разумеючы пад гэтым імем землі як літоўскіе, так і беларускіе разам. Гэта рада мелася заняцца устанаўленьнем новаго ладу ва ўсім Літоўска-Беларускім краю і прыгатаваць дзеля гэтаго скліканьне установчаго сэйму. Да яе павінны былі вайсьці 12 літвіноў, 6 беларусоў, 3 жыды, 2 палякі і 1 маскаль.

Ужо той факт, што ад Беларусі ў гэтай супольнай літоўска-беларускай радзі чысло беларусоў намечалі удвая меншае, чым літвіноў, хаця Беларускі абшар у некольні разоў большы за Літоўскі, ня мог здаволіць беларускае грамадзянство. Да гэтаго далучыліся і іншые прычыны, асудзіўшы на неўдачу гэты праект. Як даносіць жыдоўская газэта „Judische Rundschau" у нумэры 22 з дня 1.VI. 1917 г., беларусы адмовіліся ўвайсьці у склад дзержаўнай рады Літвы, пакуль ня будзе праведзена акуратная граніца між землямі беларускімі і літоўскімі. Трэба думаць, што адным са спорных пунктоў была тут і справа Вільні, каторая ляжыць на нацыональна беларускай зямлі, ды літвіны хацелі бы гэтае место з ваколіцамі яго далучыць да сваей нацыональнай тэрыторыі. На тым жэ становішчы, як і беларусы, станулі ў Расеі віленскіе жыды, лічучы немагчымым выбіраць ад сябе членоў у дзержаўную раду Літвы, пакуль ня будуць выясьнены аканчацельна адносіны між Беларусьсю і Літвой. А поруч с тым на беларускіх землях пачаў усё шырэй і шырэй развівацца рух, каторы сваей мэтай паставіў здабыцьце аўтономіі Беларусі ў фэдэрацыйнай Расейскай дэмократычнай рэспубліцы.

У месяцу красавіку ў Мінску, найвялікшым пасьля Вільні горадзі Беларусі, адбыўся беларускі конвэнт (нацыональны з'езд), зложэны с прэдстаўнікоў усіх партый Беларусі, каторы выбраў с-паміж сваіх членоў спаўніцельны камітэт с 53 асоб. Апошні с-паміж сябе выдзяліў камісію з 18 душ, якой загадаў дабіцца ад тымчасоваго ураду, каб з губэрній Мінскай і Магілеўскай і беларускіх паветоў Віленскай губ., Гродзенскай, Вітэбскай, Смаленскай і Чарнігаўскай была створэна аўтономная Беларусь. У рэзолюціі мінскаго конвэнту гаворыцца дасло̆уна гэтак: „Беларускі нацыональны з'езд, шчыра жадаючы прыняць учасьце ў супольнай справі устройства вольных народаў Расеі, загадывае свайму народнаму камітэту дабівацца паляпшэньня быту роднаго краю і, апіраючыся на краёвых элемэнтах Беларусі, працаваць супольне дзеля дзержаўнаго развіцьця Расеі на аснові фэдэрацыйна-дэмократычна-рэспубліканскаго ладу".

Другі з'езд прэдстаўнікоў Беларусі адбыўся ў Пецярбурзі. Рэзолюціі гэтаго з'езду апіраюцца на республіканска-фэдэрацыйным грунці і маюць на мэці перастройку Беларусі ў яе этнографічных межах у асобны штат расейскай фэдэрацыйнай рэспублікі. Рэзолюціі дамагаюцца далей сазыву беларускаго установчаго сходу, устанаўленьня краёваго сэйму з асобным бюджэтам, завядзеньня ўсюды беларускай мовы, як урадовай, адкрыцьця беларускіх школ усіх ступеняў, ўрэшці — учасьця міністра Беларусі ў агульна-расейскай радзі міністроў.

На тым жэ пецярбурскім з'ездзі была прынята рэзолюція, пададзеная Беларускай Соцыалістычнай грамадай, — організаціей, каторая у апошніе колькінадцаць гадоў занімала ў беларускім руху надта выдатнае становішчэ. Гэта рэзолюція занімаецца глаўным чынам грамадзкімі справамі. Трыма-

ючыся прынцыпа аддачы ўсей зямлі тым, хто сваімі рукамі яе вырабляе (без наймітоў), рэзолюція жадае, каб развязка зямельнай рэформы была аддадзена краёваму сэйму Беларусі, асудзіўшы пры гэтым самавольные аграрные выступленьня. Рэзолюція трэбуе устанаўленьня 8-гадзіннаго рабочаго дня і мінімум'а заработнай платы і прызывае пролетарыат і селян організавацца. Урэшці, рэзолюція жадае роўных правоў для ўсіх нацыянальнасьцей і правядзеньня граніц аўтономнай Беларусі у згодзі с суседзямі

Поруч с шырокім развіцьцем беларускаго руху на землях, дзе беларусы абсолютна пэрэважываюць, да нас даходзяць весьці аб беларускіх актыўных выступленьнях і на землях этнографічна мешаных, дзе беларусы становяць меншасць. Гэтак, як даносіць „Нов. Вр.", 16 мая ў Рэжыцы адбыўся людны з'езд латышоў з латышскай часьці Вітэбшчыны з галоўным местам Дзьвінскам. На з'езд прыбылі 232 выбарные ад валасьцей дэпутаты. Маршалкаваў кн. Трасун, б. дэпутат I дзержаўнай думы. Было выясьнено, што ў Латышчыне пражывае 640 тысяч душ, між каторымі 60% латышоў (каталікоў), 20% беларусоў, 12% жыдоў, 5% палякоў і 3% літвіноў. Пастаноўлено выдзяліць з Вітэбшчыны тры латышскіе пэветы і стварыць з іх аўтономную Лотву у складзі расейскай дзержавы. З'езд гэты выбраў латышскую нацыональную раду с 60 асоб, у тым ліку 36 латышоў, 12 беларусоў, 8 жыдоў, 3 палякоў і 1 літвіна.

---

У канцы—дзеля характэрыстыкі палажэньня беларускай справы ў Расеі—падаем тут вязанку дайшоўшых да нас драбнейшых, але ня менш цікавых фактоў з жыцьця закордоннай Беларусі.

На мейсцо мінскаго губэрнатара (камісара тымчасоваго ураду) назначэн беларускі грамадзкі працаўнік, Валадзімір Самойло.

Гэтак сама на мейсцо віленскаго губэрнатара назначэн беларус.

Да народнаго камітэту, выбранаго мінскім конвэнтам, вайшоў рад найбольш выдатных прэдстаўнікоў беларускаго руху. У тым ліку працаваўшые калісь у Вільні Александар Уласоў, б. рэдактар „Нашай Нівы", прыват-додэнт Вацлаў Іваноўскі і іншые.

Выдатнае становішчэ занімае галава беларускаго выдавецкаго таварыства ў Пецярбурзі, праф. Севрук.

Цэлы рад вялікшых паноў-беларусоў гэтак сама далучыўся да беларускаго аўтономічнаго руху. У тым ліву: вядомы ў Міншчыне Эдвард Войнілловіч, прэдстаўнік беларускаго праваго крыла, Булгак і інш.

* * *

С прычыны трэбаваньня беларускаім народным камітэтам аўтономіі Беларусі «Kown. Ztg.» пішэ:

„Калі, ня гледзячы на сталетні уціск, гэты народ (беларусы) захаваў у сябе дагэтуль такое сільнае і яснае пачуцьцё сваей самабытнасьці, дык гэта найлепшы доказ яго здольнасьці да жыцьця і яго здароўя. Цяперашняя Расея ўжо больш не здалее неуважліва аднасіцца да дамаганьнёў беларусоў, а прымушэна будзе іх здаволіць".

---

## Мысьлі і учынкі.

Ешчэ раз вертаемся да таго мэмор'ялу, каторы «прэдстаўнікі ўсіх кірункоў польскай палітычнай мысьлі», як сябе называюць 44 падпісаўшыеся пад ім палякі, падалі нямецкай уласьці.

Якую мысль выяўляюць гэтые паны, мы на пісьме доказоў не маемо. Але кожная мысль выяўляецца ў учынках, — і вось узнімаецца пытаньне: чы тые паны і на далей маняцца выяўляць у сваіх паступках такіе-ж самые мысьлі, якіе ў апошніе гады выяўляліся ў аслаўленай польскай местовай управе ў Вільні, якіе гэтак ярка выявіліся у справе Янішскай і у здарэньнях, адбыўшыхся ў касьцелі сьв. Яна; чы можэ тые мысьлі, якіе зусім выразна праводзіло „grono osob" пры раздзелі грошы, прысланых с Цэнтральнаго Камітэту ў Вэвэй— „для насяленьня, каторае гаворыць па польску, па літоўску і па беларуску"; а мо' тые мысьлі, каторые выявіліся ў Віленска Ковенскім Грамадзянскім Камітэці і прымусілі беларусоў, літвіноў і жыдоў выступіць з яго, напісаўшы на пісьме выясьненьне прычын свайго выхаду; чы ешчэ тые, якіе праводзіліся ў местовай міліціі, праводзяцца цяпер у „Гандлёвым Банку", польскім таварыстве помачы ахвярам вайны, дзе справа помачы звязана з апалячываньнем нашаго народу, — ўрэшці, ў сыстэмі польскіх школ у чыста беларускіх і літоўскіх ваколіцах?!...

Гэтулькі аб мысьлі і ўчынках. А што-ж далей?

Далей «палякі з Літвы» вымагаюць «такіх самых варункоў і дзеля сябе», як другіе маюць. Але аб якіх гэта варунках ідзе гутарка? Калі аб тых, якіе „палякі з Літвы", маючы ў нас сілу, праз доўгіе гады сваей тут гаспадаркі стварылі для грамадзян краю не-палякоў, — дык мы ім таго ня жычым! Калі-ж справа йдзе аб свабоднае нацыянальнае развіцьце, дык скажэмо ім проста: даволі круціць — мы ўжо на гэтым знаемся; а калі хочэце грамадзкай згоды з усімі жыхарамі краю, дык станавіцеся з імі на роўных правох і пакіньце сьмешную думку аб тым, каб польскае панство панавало над. мільёнамі тутэйшаго народу — беларусамі, літвінамі, жыдамі,—пакіньце мысьлі аб апалячэньні краю і пакажыце гэта ня толькі на словах, але і на дзелі, працуйце дзеля карысьці краю і дзеля волі для яго, і толькі тады будзеце мець роўны з другімі голас у справі будучыны нашай Бацькаўшчыны!

—ік.

---

## Польская тактыка.

Мы ўжо раз адзначывалі, што польскіе газэты ў Польшчы пачалі вельмі цікавіцца беларускімі справамі («Nowa Reforma», «Czas»). Разам с тым мы паказвалі, якую брахню пішуць тамтэйшые пісакі „za dwa grosze». Цяпер перад намі новы доказ, як нізка ўпала польская публіцыстыка ў часі вайны. Доказ гэты дае нам стацьця, надрукованая ў № 258 кракоўскай газэты «Czas» с 6 чэрвеня г. г. пад загалоўкам „Палажэньне ў Літве".

У гэтай стацьці гаворыцца і аб літвінох, але на гэта ніхай адказваюць самі літвіны. Мы-ж разгледзім тое ў ёй, што так ці сяк датыкаецца беларускай справы.

„...беларуская школьная справа карыстае з асаблівай паддзержкі, пры гэтым беларускіе школы адкрываюць у ваколіцах з мешаным насяленьнем, часта замест закрываных польскіх школ.

„У лютым 1916 году нямецкіе ўласьці аснавалі „Гоман", каторы друкуецца ў друкарні нямецкай газэты «Wilnaer Zeitung»,' і абедзьве газэты маюць аднаго супольнаго рэдактара. Кожын стараста павінен выпісываць „Гомана", і газэта шырыцца праз паветовые урады. Аднак, усе гэтые спосабы ня мелі вялікай удачы. З гэтаго можна бачыць, што ўплыў газэты—паверхнасны. Аб духу, ў якім вядзецца газэта, можна сказаць, што ў кожным нумэры кідаецца ў вочы антыпольская тэндэнція. Паўтараюцца дурные скаргі на польскі уціск, напасьці на дзержаўную раду і кароннаго маршалка; а польская шляхта і духавенство выстаўляюцца заўсёды ў найгоршым асьвятленьні.

„Аднак, уся гэта агітація ня мела ўдачы. У часі спісу насяленьня ў ліпню 1916 г. блізка ўсе селяне-каталікі запісаліся палякамі. Яны пазабіралі сваіх дзяцей з беларускіх школ, і ўсюды, дзе паны ўвадзілі у сваe школы беларускую мову, яе на жаданьне селян прыходзілося выкідаць. Спіс насяленьня павінен быў пэрэканаць нямецкіе ўласьці, што, ня лічучы Ковеншчыны, у насяленьні пэрэважываюць палякі. У Віленскім пав. 60% жыхароў — польскай нацыональнасьці; гэтак сама ў Троцкім павеці і ў паўночнай часьці Гродзеншчыны процэнт палякоў яшчэ вялікшы. У месьці Вільні жывуць толькі палякі і жыды: з іншымі нацыональнасьцямі зусім нельга лічыцца. Рады соцыалістычнай партыі складаюцца с польскіх работнікоў".

Дык вось якую брахню пазваляе цяпер сабе пісаць калісь найбольш сур'ёзны польскі орган, каторы, ня гледзячы на яго консэрватызм, паводлуг яго вагі можна было-бы прыраўнаваць да органа маскоўскай профэсуры «Русскія Ведомості» Бо тут брахню становіць даслоўна кожнае слова!

Перш за ўсё брэхня—і то брэхня зусім сьвядомая, бытцым «Гоман» друкуецца у друкарні урадовай нямецкай газэты «Wiln. Ztg.» Пачынаючы ад першаго нумэра, «Гоман» друкаваўся і друкуецца ў літоўскай друкарні М. Кухты, Татарская 20, дзе дзесяць гадоў друкавалася «Наша Ніва» і чысьленые беларускіе кніжкі. Праверыць гэта магла сама рэдакція «Czasu»: трэбало толькі ўзяць нумэр «Гомана» і прачытаць подпіс друкарні на канцы газэты. Ешчэ горшая, зусім нягодная брэхня, бытцым «Гоман» і «Wiln. Ztg.» маюць аднаго супольнаго рэдактара: газэта вядзецца групай беларускіх грамадзкіх дзеячоў, каторым дадзена на гэта нямецкімі ўласьцямі концэсія на пісьме, так сама, як выдаваным у Вільні польскай і жыдоўскай газэтам. I гэтак — усё да канца, не выключаючы спосабу шырэньня і тэндэнціі газэты, а так сама яе вагі ў народзі.

Далей газэта «Czas» на моцы цыфр, каторым не прыдае ніякай вагі ні адзін сур'ёзны чэлавек у нашым краю, бо польскіе рахмістры пэрэраблялі немагчыма статыстычные данные, стараецца давясьці, што і беларусоў тут німа ніякіх, што іх штучна нехта робіць. Газэта зусім сьвядома брэшэ аб закрываньні польскіх школ і адкрываньні замест іх беларускіх: такіх фактоў дагэтуль нідзе не было, а найлепшы доказ брахлівасьці «Czasu»—тое, што для каталікоў на правінціі дагэтуль не заложэна ні адна урадовая беларуская школа. Аб тым жэ, каб паны ўводзілі у сваіх школах, назначэных для апалячываньня беларусоў, беларускую мову, можэ гаварыць толькі чэлавек не зусім пры розуме!.. Так сама і аб забіраньні дзяцей з беларускіх школ: тож тых школ дагэтуль зусім не было, дык і забіраць не было скуль!

Прынімаючы пад увагу, якіх нягодных спосабоў ужывае „Czas", каб апаганіць беларусоў, трэба прызнаць, што палякі вельмі тых беларусоў баяцца і праўдай зваваць іх не спадзяюцца. Тым болей дзіўна, што польскіе публіцысты адначасна стараюцца пэрэканаць сваё грамадзянство аб слабасьці тых-жэ беларусоў! I гэта можна растлумачыць толькі адным спосабам: што нацыональная ненавісць і сьляпы шал пранікнулі вельмі глыбока ў польскае грамадзянство і асьляпілі яго.

У канцы—некольні слоў аб „мешаных" ваколіцах. „Мешанымі" называюць палякі ўсе вёскі, ў каторых жыве ад вякоў беларуская масса, але ксяндзу або „паненцы з двара" ўдалося навучыць школьных дзяцей круціць сваю гутарку на варшаўскі лад, дэклямаваць вершык „Kto ty jesteś— polak mały", стыдацца сваіх бацькоў і свайго народу і называць сябе „палякамі", або „польскай веры". I мы шчыра бы цешыліся, каб голас „Czasu" аб ладжэньні ў такіх мейсцах беларускіх школ замест польскіх аказаўся бы прарочым голасам!

Дай Божэ хутчэй!

---

## На вёсцы.

Шырокае поле... На полі
Калосься на сонцы блішчаць,
I птушкі гуляюць на волі
Ды весела ў высі крычаць.
Вось, жаўранак ў небі сьвіргочэ
Вясёлую песьню сваю,
Там бусел ў балоці клякочэ,
Там стукае дзяцел ў гаю.
Тут ходзе па лесі скацінка,
Авечкі вясёла бляюць,
За імі ўсьлед ходзяць дзяўчынкі
I родные песьні пяюць.
На дрэві зязюлька кукуе,
Там песьню завёў салавей,
Галуб штось з галубкай варкуе,
Як муж аб чым з жонкай сваей.
Тут хатка схінулась крывая
С падзёртай с саломы страхой;
Відаць, яе доля ліхая,
I пэўне знаёма з бядой...
А тут вось стаіць пад лясочкам
Спалёная вёска вайной.
Магіла відаць недалёчка—
Ваякоў забраў люты бой.
I дзіўные думы прыходзяць,
Як глянеш на гэты на сьвет:
То радасць на сэрцэ наводзяць,
То сумна з адных толькі бед...

*В. Лемеш.*

Корэйвішкі 16.6.17.

---

## У Вільні і ваколіцах.

× **Гэрбовы збор с пасажырскіх білетоў і накладных.** Ад 1 ліпня г. г. ў межах Обэр Ост будуць браць гэрбовы збор з усіх пасажырскіх білетоў і накладных.

С кожнаго білету, незалежне ад клясы, цаной ад 50 фэн. да 1 м. 95 фэн. будуць браць 10 фэн. гэрбоваго збору, каторы сам сабой будзе узрастаць, даходзячы 2 м. з білету цаной 15 м.

Гэрбовы збор з накладных пачынаецца ад 20 фэн. і будзе дахадзіць да 4 м. 50 фэн.

Ад гэтаго збору звальняюцца пэрыодычные білеты для вучнёў.

× **Фальшывые грошы.** У апошнім часі ў занятых землях з'явіліся падробленые двохмаркоўкі, вельмі падобные да праўдзівых. Вось адзнакі падробленых: папера — бялейшая, чым у праўдзівых; воднаго бязцьветнаго знаку зусім або блізка зусім німа; выпуклае кляймо вельмі слаба значно. Глаўны урад «Darlehenskasse Berlin» суліць награду да 1000 м. таму, хто першы пакажэ на «майстроў», ды калі іх можна будзе пакараць.

